# Манументальнае мастацтва: рознае, але цэласнае

**6 ліпеня ў галерэі "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава "Манумент", якая ладзіцца ў межах Рэспубліканскага фестывалю манументальнага мастацтва. Ён задуманы як маштабны выставачны марафон, прызваны аб'яднаць на розных арт-пляцоўках сталіцы мастакоў-манументалістаў з Мінска і рэгіёнаў Беларусі. Праект падрыхтаваны секцыяй манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага саюза мастакоў.**

Адкрыла выставу прывітальным словам дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава, якая заўважыла, што адна з мэт экспазіцыі — напоўніцца эмоцыямі ад твораў вядомых і маладых беларускіх мастакоў-манументалістаў.

Першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч падкрэсліла, што кожны мастак беларускай манументальнай школы — бліскучы майстар. "Гэтай выставай нам хацелася паказаць, наколькі у нас рознае беларускае мастацтва. І галоўнае ў ім — гэта любоў да той зямлі, дзе яно стваралася", — працягнула сваё выступленне мастацтвазнаўца. Таксама Наталля Шаранговіч адзначыла, што выстава завяршае Рэспубліканскі фестываль манументальнага мастацтва, і падзякавала Нацыянальнай бібліятэцы за арганізацыю экспазіцыі.



Мікалай Кухарэнка. Нацюрморт з краявідам.

Старшыня секцыі манументальнага мастацтва куратар фестывалю Васіль Зянько расказаў, што работы манументалістаў зараз усюды. А жывапісец-манументаліст член Беларускага саюза мастакоў Сямён Дамарад адзначыў: моладзі неабходна сёння мець зносіны з мастакамі, непасрэдна ў рэальнасці бачыць іх творы. Таксама Сямён Дамарад як творца заўважыў, што добра, калі чалавек бачыць у творы нешта сваё, гэта азначае, што карціна жывая.

"Гэта чалавек, які ўлюбёны ў пяшчотную серабрыстасць беларускага пейзажу. Таго сапраўднага пейзажу, які мы заўсёды бачым вясной або ўвосень, калі адпачываем душой. Вось гэтая далікатная пяшчотнасць адрознівае Сямёна Дамарада ад іншых", — так апісала мастака мастацтвазнаўца Наталля Шаранговіч. Акрамя работ Сямёна Дамарада, наведвальнікі экспазіцыі маюць магчымасць пазнаёміцца з творчасцю Каміля Камала, Сяргея Бышнёва, Алеся Сушы, Сяргея Крышталовіча, Андрэя Скіцёва, Андрэя Кальгі, Уладзіміра Дзядзюлі.

Мастакі пішуць свае творы ў розных жанрах і стылях, але разам іх работы ствараюць вялікае гарманічнае палатно манументальнага мастацтва. У цэлым жа жывапіс расказвае пра жыццё — мудрае і прыгожае.

Выстава будзе працаваць да 1 кастрычніка, аднак арганізатары папярэджваюць, што дата заканчэння работы экспазіцыі можа быць зменена. Уваход — па чытацкім білеце Нацыянальнай бібліятэкі або білеце сацыякультурнага цэнтра.

**Ягор ГЕРМЯНЧУК,**
**студэнт факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота аўтара.**